# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ДРЭВА Ў КУЛЬТУРНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ

***Слашчова Мілана, Рэспубліка Беларусь***
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт,*
*Рэспубліка Беларусь, г. Мінск*
*Навуковы кіраўнік – ст.выкладчык Носік А.А.*

*Анатацыя.* Артыкул прысвечаны разгляду важнай ролі дрэў у культурнай карціне Беларусі, а таксама іх асвятленню ў фальклоры і культуры беларускага народа. Звернута ўвага на тое, што лясы з’яўляюцца найважнейшым аднаўляльным прыродным рэсурсам Беларусі і выконваюць асяроддзеўтваральныя, прыродаахоўныя і культуралагічныя функцыі.

*Ключавыя словы: лес, дрэвы, культура Беларусі, каштоўнасці.*

Чалавек і лес – спрадвечныя сябры. Немагчыма ўявіць жыццё на Зямлі без лесу. Лес – гэта грыбы і ягады, лекавыя расліны, каштоўная драўніна, з якой чалавек атрымлівае каля 30 тысяч вырабаў. Лес дапамагае захоўваць у зямлі вільгаць, без якой перасохлі б рэчкі і азёры. Але самае галоўнае – гэта тое, што лес ачышчае паветра ад вугляроду, перапрацоўвае яго і выдзяляе неабходны для ўсяго жывога кісларод. Асноўнымі дрэвамі беларускіх лясоў з’яўляюцца дуб, ліпа, сасна, асіна [2, с. 19].

Дуб – магутнае лістападнае дрэва. Са словам *дуб* звязаны ўяўленні аб прыгажосці, моцы, магутнасці, непахіснасці, велічнасці. Старажытныя славяне адносілі дуб да ліку свяшчэнных. У засені дубоў яны збіралі ваенныя нарады, прымалі важныя дзяржаўныя рашэнні, прыносілі ахвяры сваім багам. Адпраўляючыся на вайну ці ў далёкае падарожжа, славяне ішлі да самага магутнага дуба, зрывалі ліст і хавалі яго ля сэрца. Гэты ліст-талісман нагадваў вандроўніку аб радзіме, а воіна ахоўваў ад ран і смерці ў баях.

Адвар кары дуба здаўна прымяняецца для лячэння кроватачывасці дзяснаў, запаленчых захворванняў поласці рота і глоткі, як і дубовае лісце, якое ўтрымлівае вялікую колькасць фітанцыдаў, што згубна ўздзейнічаюць на хваробатворныя мікраарганізмы. Менавіта таму яго заварваюць як чай і п’юць пры інфекцыйных захворваннях. Каштоўным лячэбным сродкам з’яўляюцца дубовыя жалуды – яны прымяняюцца для вырабу кавы, а таксама ў якасці корму для  жывёл [1, с. 34].

Як вядома, значнае месца ў традыцыйнай культуры беларусаў займаюць прыметы і павер’і. Добрае веданне прыроды дапамагала чалавеку прадказваць надвор’е і планаваць сваю дзейнасць. Вось некалькі павер’яў, звязаных са станам дубовых дрэў і іх роляй у светабачанні нашых продкаў: *Калі дуб зазелянее раней за ясень – можна з упэўненасцю чакаць сухога лета, у адваротным выпадку лета будзе мокрае; Шмат жалудоў на дубах – будзе цёплая зіма; Калі ліст з дуба і бярэзіны ападзе чыста – будзе лёгкі год, нячыста – цяжкая зіма* [3, с. 113].

Ліпа. У даўнія часы ліпа лічылася свяшчэнным дрэвам – менавіта на ліпавых дошках пісалі іконы. Варта прыгадаць, што самым распаўсюджаным абуткам на Русі былі лапці, якія пляліся з кары дрэва, вось і стаялі ліпкі “раздзетыя”, а ў народзе з’явілася прымаўка *абадраць як ліпу*, што азначае ‘адабраць у чалавека ўсё, што ён мае’. З ліпавай драўніны ў наш час робяць музычныя інструменты, мэблю, фанеру, прадметы хатняга ўжытку. У традыцыйнай беларускай культуры з ліпай звязаны некаторыя прыметы, напрыклад: *Як ліпавы цвет вельмі запахне, то будзе дождж* [3, с. 114]. Ліпа лячыла розныя хваробы, асабліва псіхічныя. Хворы павінен быў пралезці праз адтуліну ў дрэве, калі не сам, то пры дапамозе іншых. Пасля трэба было разарваць тую частку адзення, якая дакраналася да хворага месца. Такое адзенне пакідалі на дрэве і надзявалі новае [4].

Хвоя – старажытнае вечназялёнае дрэва, якое здаўна расце на тэрыторыі Беларусі і часта згадваецца як сімвал бяссмерця і жыццёвай сілы: нават у моцныя маразы яна не губляе сваёйігліцы. З трэшчын кары хвоі або спецыяльных надрэзаў павольна сцякае светла-жоўтая празрыстая смала – *жывіца*. Многія мільёны гадоў шчодра выцякала яна з паламаных бурай хваін, застывала ў цвёрдую масу, якую цяпер усе ведаюць як бурштын (*рус.* янтарь ) [2, с. 20]. Хвоя выдатна служыць не толькі чалавеку: птушкі здабываюць з сасновых шышак карысныя пажыўныя рэчывы, імі ласуюцца вавёркі, бурундукі, ласі і іншыя лясныя жыхары. Нават рыбы ахвотна спажываюць хваёвы пылок, што ў перыяд цвіцення дрэў тонкай плёнкай пакрывае вадаём. Вераванні нашых продкаў, звязаныя з хвояй, зазначалі наступнае: *Калі ў час марозу пачнуць падаць з елак і хвой шышкі, то тады трэба чакаць хуткай адлігі* [3, с. 113].

Асіна. Гэта дрэва давала ў мінулыя гады сялянству пруткі для пляцення кошыкаў і дапамагала забудоўвацца пагарэльцам пасля вясковых пажараў. Яго горкую кару з задавальненнем спажываюць зайцы і лясныя веліканы ласі. З асіны вырабляюць мільёны пачкаў запала.

Адвары пупышак або спіртавую настойку кары асіны здаўна прымянялі пры лячэнні розных захворванняў[1, с. 34]. Асіня з’яўляецца састаўной часткай кармавых дражджэйа пры дабаўленні ў рацыён яны садзейнічаюць паскоранаму размнажэнню сельскагаспадарчых жывёл і птушк і павышэнню іх прадукцыйнасці. У працэсе назірання за асінай з’явілася наступная прымета: *Калі на асіне рана пачырванее лісце, то восень будзе ціхая, ясная ды цёплая, быццам лета* [3, с. 113].

Такім чынам, з даўніх часоў лес быў верным сябрам чалавека. Усё, што расце ў лясным гушчары, знаходзіць ужыванне ў побыце: людзі збіраюць грыбы, ягады і арэхі, а расліны, якія растуць у лесе, ужываюць іх у лячэбных мэтах. З масіву дрэва ствараюць мэблю, паперу, музычныя інструменты, будуюць дамы і выкарыстоўваюць яго як паліва. Значэнне лясоў для чалавецтва немагчыма пераацаніць, паколькі яны выконваюць шмат важных

функцый у забеспячэнні спрыяльнага навакольнага асяроддзя для ўсяго жывога на Зямлі.

Літаратура:

1. Александровіч, Р. А. Зямля з блакітнымі вачыма / Р. А. Александровіч, Т. П. Нескаромная. – Мінск, 20018. – 154 с.

2. Грышкевіч, І. К. Спадчына маёй краіны : матэрыял для азнаямлення дзяцей з гісторыяй і культурай Беларусі. У дзвюх частках. Ч.1/ І. К. Грышкевіч. – Мазыр : Содействіе, 2015. – 128 с.

3. Ад парога ў свет дарога : народныя прыкметы і павер’і / уклад. Уладзіміра Васілевіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. – 126 с.

4. Дрэвы-лекары ў Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://slushna.by/drevy-lekary-u-belarusi-kudy-paexac-kab-atrymac-porcyyu-zdarouya/]. – Дата доступу: 18. 09. 2024.